Горецкий выбор

Антибашистская газета

Башизм - «Репрессивный режим, направленный на подавление прогрессивных общественных движений, на уничтожение демократии».

С.И.Ожегов, «Толковый словарь руского языка», на букву «Ф»

№ 28, октябрь 2007г.

Кожны выбірае па-свойму

Як жа шмат залежыць ад правільнага зробленага выбару! Выбіраюць усе, выбіраюць усё, але адны бачаць толькі сёняшні дзень, другія гладзяць далей. Адны лічаць за лепшае трымацца за тое што маюць на сёння, і каб ні ў якім разе не страціць: пасаду, працу, службовае становішча. Другія думаюць пра будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў, бо разумеюць што іхні лёс залежыць ад дзяржаўнага ладу, ад таго як будзе дзяржава захоўваць іхнія правы. Канешне калі казаць пра будучыню ўнукаў, то нашы дзяржаўныя дзеячы аб сваіх клапоцяцца, хаця б таму што маюць магчымасць даць добрую адукацыю, шмат хто - і за мяжой.

Ну а які лёс чакае нас з вамі, нашых дзяцей, унукаў? Давайце паразважаем, бо гэта толькі на першы погляд галоўным з'яўлаецца добры харч і вопратка. Гэта важна, але не галоўнае. Добры харч і цёплы хлеў задаволіць і парсючка. Чалавек жа яшчэ і думае. І хаця б сам сабе задае пытанні: чаму, калі ты ў такой добрай дзяжаве жывеш, дарэчы, жывеш у параўнанні з іншымі краінамі вельмі мала? Чаму ад такога добрага жыцця нас усё меней і меней? Чаму у самай дэмакратычнай краіне забараняюць ня толькі свабоду слова, свабоду шэсцяў, але навогул - проста хадзіць па сваёй зямлі там, дзе хачу.

Я асабліва вырашыў наведаць пад Воршай месца нашай вайсковай славы на Крапіўне, дзе нашы славутыя продкі 8 вераня 1514 года ушчэнт разбілі захопнікаў. Хацеў, каб і ўнучка ведала гісторыю айчыны, каб паслухала сучасных паэтаў, бардаў, хацеў паглядзець рыцарскі турнір. Але нічога не атрымалася, аказваецца знайшлі міну, ачапілі поле славы васкоўцамі, а на дарогах выставілі шмат міліцыянтаў - каб не было сумна, дык было б вельмі смешна. Завезлі нас у гарадзкі аддзел, перапісалі, пратрымалі тры гдзіны. Пытаюся за што? Адказ – маем права! Так то яно так, але ж трэба мацць яшчэ і маральнае права, дый папрасіць прабачэння за бязглуздзіцу. Выходзіць што злодзеяў няма каму лавіць. Ці думалі мы што нас чакае такі, лёс калі 27 ліпеня 1991 года абвяшчалі незалежнасць рэспублікі? Ці думалі мы усе калі слухалі па тэлівізіі і радыё, тады яшчэ дэпутата А. Лукашэнку (Які крыў на чым свет стаіць усю уладу), што калі ён прыйдзе да улады, то ўсе гэта кане ў лету, што затанеццца свабода слова толькі для аднаго чалавека. Што з намі стала?

Збіраю подпісы па вылучэнні у абласныя дэпутаты, прабачце, за сябе. Шмат хто адмовіўся і не толькі таму што я такі ўжо дрэнны, (урэшце - не галасуй), проста баяцца - так і казалі. Гэта наш выбар. З самага верху чуваць заклікі да барацьбы з карупцыяй, прыводзяць прыклады пакарання за яе. Але ці можна сапраўды весці барацьбу з карупцыяй, калі нідзе у нашых СМІ не ма крытыкі у адрас вышэйшага чынавенства. Вы чыталі шаноўныя ў "Савецкай вёсцы" Крытыку па выканкамаўцаў? Але ж гэта наша газета, бо яна выдаецца за нашы падаткі. Чыноўнік павінен адчуваць кантроль грамадзкасці. Трактарыст, даярка не будуць карупцыянерамі. Колькі разоў мне заяўлялі дактары, настаўнікі: я джяржслужачы і нічога не падпішу, бо ёсць кантракт. Гэта так, а мне па-першае, служба дзяржаве і служба адной асобе, гэта, як кажуць у Адэсе рэчы розныя, па другое - гэта быў наш выбар, заставацца сляпымі, глухімі, нямымі. Зараз дзяржава хавае ад грамадзкасці сапраўднае становішча, па чарнобыльскім праблемам. Інакш чаму не дазволена друкаваць артыкулы І. Нікітчанкі на гэту тэму. Ня ведаю як паўплываюць на здароўе людзей лядовыя палацы, а з тым, што недастатковае абследванне хаця б дзяцей, не дабавіць ім здароўя, усе вы пагадзіцеся. Гэта вельмі сур'ёзная праблема для нас усіх, трэба біць ва ўсе званы. А каму біць?

У нармальных краінах ёсць улады, ёсць апаненты улады, што есьць нармальна. Могуць памыляцца, і тады іх трэба ставіць на месца. У нас жа ёсць улада і ворагі ўлады. Гэта ненармальна. Мы ня ворагі - ў нас адна краіна, нам жыць у ёй. Давайце ставіць праблемы на абмеркаванне, весці спрэчкі адкрыта і цывілізавана, хай людзі слухаюць і робяць свой выбар. Я шмат гадоў працаваў кіраўніком саўгаса, а затым калгаса, і бывала так, што просты чалавек даваў параду такую, што ні я, ні хто са спецыялістаў ня мог да гэтага датумкаць. Так што мы ня дурані. Трэба толькі даць нам мажлівасць зрабіць свой выбар.

Мікалай Юркоў

Выступ Аляксандра Мілінкевіча перад удзельнікамі Еўрапейскага марша

Грамадзяне Беларусі!

Сёння мы прайшлі маршам. Сёння мы перамаглі страх.

Страх – ён як іртуць. Ён разліты па нашай краіне. Ён атруціў нашы душы.

Але мала перамагчы страх адзін раз.

Нам трэба раз за разам выходзіць на цэнтральныя праспекты і дэманстраваць сваю любоў да Айчыны, волю да Свабоды, свой выбар еўрапейскага шляху развіцця.

Маніфестацыі — самы эфектыўны спосаб барацьбы за свабоду. Седзячы ў хаце — нічога не даб'емся. Трэба выходзіць! Столькі, колькі спатрэбіцца, каб вызваліць саміх сябе і наш народ. Няма іншай рады. Свабоды трэба дамагчыся, яе трэба заслужыць. Так рабілі іншыя народы Еўропы.

Прэч сумневы, у адзінстве сіла!

Улады затрымалі дзясяткі людзей у сталіцы і ў рэгіёнах, бо ўздыму рэгіёнаў яны найбольш баяцца,. Улады смяротна баяцца масавасці маніфестацый. Але гэтыя людзі душою і думкаю з намі.

Яны - з намі, мы – заадно! Жыве Беларусь!

Дзяўчаты і хлопцы! На вас, наша моладзь, надзея! Слухайце сваё сумленне, рабіце дабро і нічога не бойцеся.

Сябры Беларусі з розных краінаў Еўропы прыехалі 14 кастрычніка ў Мінск. Дзякуй ім!

Звяртаюся і да тых, хто яшчэ не адолеў страх, хто яшчэ не ачысціўся ад іртуці хлусні. Мы адна нацыя. У нас роўныя правы і супольная будучыня. Мы — еўрапейцы! Мы — гаспадары дзяржавы, мы — крыніца ўлады. Падтрымайце еўрапейскі выбар для Беларусі! Гэта адзіны шлях да здароўя нашых унукаў, добрае адукацыі для дзяцей, дабрабыту, які адбудавалі ўжо сабе іншыя нацыі Цэнтральнай Эўропы.

Ад свабоды выйграюць усе. Нават тыя, хто цяпер яе баіцца.

Мы - цэнтральнаеўрапейцы! І мы кажам – жыла і жыве Беларусь!

Каб сонца засланіць, вушэй асьлінных мала

Осень в Киев не спешит. По картинке - отставание от нашей действительности примерно в две недели, довольно тепло и без дождей. Как и в любом другом мегаполисе, все куда-то торопятся. Переполненное метро привлекает равно как скоростью, так и ценой. Пятьдесят украинских копеек за поездку даже при диких горецких курсах продажи гривны (в Минске украинские «гроші» можно купить по 455, в Орше – по 430) «в переводе» означают никак не более 250-260 руб. На тесноватых старых станциях особенно в часы пик - серьезная давка. Бывает, что до турникета добираешься мелкими шажками и затем выстаиваешь длинную очередь на эскалатор. При этом люди доброжелательны, не слышно ни перебранок, ни даже мата. Поезда переполнены, то и дело следуют просьбы по радио освободить двери и побыстрее заканчивать посадку. И вагоны и станции – сплошь в рекламе. Кредиты за один час... пиво «Черниговское»... требуются менеджеры – зарплата от 1500 гривен – этих особенно много, видимо, на такую зарплату менеджеры не клюют...

На улицах мало «державніх» автобусов и троллейбусов (проезд - те же 50 коп.) и множество частных маршруток - в подавляющем большинстве это знакомые нам желтые «Богданы». Проезд в них хоть и стоит, как минимум, вдвое дороже (1-1,75гр.), но и они всегда переполнены. Не забудем, что это Киев – столица. Для сравнения - в Минске маршрутки возят за 1500, а метро и гостранспорт берет с пассажира по 600 руб. При этом в Киеве даже бабушки на остановках не ждут «халявного» автобуса, а садятся в маршрутку и едут. Остановки - по требованию. Во всех маршрутках висит постановление горисполкома, гласящее, что городской транспорт (даже автобусы) может останавливаться в местах, где это не запрещено правилами движения. И ничего - останавливаются. Людям удобно и перевозчикам - деньги. Заметно, что они у народа здесь есть, и те, кто хочет, заработать их в состоянии – государство, как минимум, не мешает. На вопросы о заработке большинство отвечает неохотно, добавляя затем: «Но это – официально». Даже уборщица в парикмахерской (формальный оклад – 200 гривен в месяц) загадочно улыбается. Дескать, чаевые перепадают, кто даст рубль (многие так называют гривну), кто – два... Таксист, работающий на хозяина, получает в Киеве 1000 долларов, в райцентре Золотоноша Черкасской области – 1000 гривен. У входов на станциях метро везде приглашают продавцов телефонных карточек и прочей мелочевки. Зарплата от 100 гривен в день.

Уличная торговля развита по всему городу. Никто никого не гоняет - на тротуарах, перекрестках, остановках, множество лотков, палаток, которые торгуют уже с 7-8 утра и сворачиваются с наступлением темноты. Как результат – грязновато, но порядок поддерживается, хотя и без фанатизма. В то же время – характерного постсоветского нытья о тяжелой жизни тоже немало. На остановках ворчат о переполненном транспорте, в автобусах поругивают власть.

Столь любимые нашим БТ бомжи в самом деле наличествуют (посмотришь сюжет, особенно, если в нем присутствует нечто про Ющенко – и кажется, что полстраны там копается в мусорках), но таковых - единицы. Кормятся возле вокзала, на базарчиках, иногда просят деньги в переходах (в основном древние бабушки). Отношение к ним у простых людей снисходительное, дескать, кто крутится – тот всегда заработает, а это – алкаши и лодыри. В тех же переходах - музыканты, на Крещатике мальчишка лет десяти играет на скрипке. У некоторых – электроаппартура, видно, что работают не первый день. В лежащих у ног футлярах – не только мелочь, но и купюры с нулями. Власть этих людей как минимум не трогает, поскольку те у нее ничего не просят, а народ подает охотно – в Украине трудяг уважают.

Пригласившая нас Международная общественная организация «Интерньюз-Украина» - наиболее крупная из тех, кто в своей стране занимается реализацией международных программ по развитию прессы. Уточню, что понятий «залежная» и «незалежная» там нет. Просто – прессы. Проект, в рамках которого мы учимся, имеет название «У-Медиа» и проводится в партнерстве с «Интерньюз-Нетворк», который финансируется (не в Беларуси будь сказано) USAID – Агентством США по международному развитию.

Цель проекта – развитие гражданской журналистики. Это как раз про нас и наших коллег. Имеются в виду люди без специальных дипломов, которые хотят выпускать собственные издания. Во всем цивилизованном (за исключением отдельных заплутавших в идеологических джунглях островков) мире признано, что такие проекты зачастую бывают весьма успешными и создают серьезную конкуренцию авторитетным «таймсам». При этом их трудно прикормить и контролировать, что дает возможность работать по известному принципу азиатских акынов: «Что вижу – то пою».

Чтобы не возвращаться к теме, сразу же отвечу потенциальным разоблачителям, которых начиная с 1937-го года заклинило на теме оплаченного шпионажа в пользу гадов-капиталистов. Их способы наведения тени на белый день неоднократно описаны классиками литературы, включая незабвенного белоруса Кадрата Крапіву. Проснитесь. Во всем мире (за исключением уже упомянутых островков) является нормальной практикой поддержка своих своими. То есть, коллеги с большими (ударение можете ставить и на первом и на втором слоге) возможностями помогают тем, у кого этих возможностей меньше. При этом речь не идет о «мешках баксов», тайно перевозимых через границу. Зарубежные коллеги дают нам ВОЗМОЖНОСТИ, подтягивая до уровня, являющегося для них нормальным.

Среди партнеров наших украинских коллег есть и частные фонды, и правительственные «институції», и международные организации. Глава правления «Интерньюз-Украина», Константин Квурт, является членом Национальной комиссии по утверждению свободы слова и развитию медиа-пространства, созданной в качестве консультативного органа Президентом Украины Виктором Ющенко.

Еще в начале XXI века подобные проекты существовали в Беларуси, в том числе работа по ним шла и в Горках. «Айрекс про медиа», «Каунтерпарт фор партнершип» - горецким общественным активистам эти названия наверняка знакомы. Да и в райисполкоме времен Владимира Долженкова с их представителями общались неоднократно, организовывали совместные проекты... Увы, ситуация со свободой слова в нашей стране с той поры круто пошла под откос, и все подобные программы наше правительство свернуло, имея, похоже, в виду, что «Советская Белоруссия»

- лучшая общественно-политическая газета, и нечего тут...

Хотя даже первые результаты, полученные тогда в результате сотрудничества, до сих пор приносят определенную пользу. Благодаря поддержке «Айрекса» закрепилась на информационном рынке «Регионалка», Проводившиеся «Каунтерпартом» пресс-клубы дали импульс началу нашего «УзГорка», а тренинги и семинары помогли найти себя многим местным общественным активистам.

Обучение проходит в прекрасном офисе, где имеется достаточное количество техники, а к проведению тренинга привлекаются специалисты, работающие на весьма и весьма солидном уровне. Достаточно сказать, что человек, проводивший занятия по фото- и видеосъемке, является главным оператором в одной из ведущих телекомпаний своей страны. Участники тренинга – в основном молодые ребята, работающие в разных сферах информационного пространства и стремящиеся развиваться, несмотря и вопреки. Надо ли говорить, что в «СБ» и прочих «чэсных» изданиях стройными рядами (где шаг вправо-влево – побег) шагающих шляхом в никуда, большинству из них будет тесно и захочется чего-то большего, нежели сводки о битвах с урожаем. Благо, существующие ныне технологии позволяют многократно усилить снова ставшую в нашей стране актуальной фразу уже упоминавшегося Кондрата Крапивы, которая так и просилась в заголовок.

И в заключение – предложение для читателей. МЫ БУДЕМ СНИМАТЬ КИНО. Редакция в партнерстве с МОО «Интерньюс-Украина» объявляет конкурс тем, сценариев, идей для короткометражных видеофильмов на социальную тематику. Если можете снять что-то сами – снимайте. Хотите предложить сценарий, сюжет, тему, идею – предлагайте. Желающие могут побывать в шкуре режиссера, оператора, монтажера. Техника и специалисты в редакции есть. При этом, Ваш возраст и социальное положение значения не имеют. Ждем.

Эдуард БРОКАРЕВ

На улицах Киева

Корреспондент нашей газеты спрашивал прохожих: "Что первое Вам приходит в голову, когда Вы слышите о Беларуси?"

Валентина, прохожая с большой сумкой:
- Лукашенко и хорошие дороги.

Анатолий, менеджер по продажам:
- Тракторы. Я сам из села и часто там их видел.

Евгений, студент универститета:
- Камеди-клаб. И там хорошо играют в футбол.

Марина, педагог:
- Природа красивая и люди приятные

Людмила, медсестра:
- Я знаю, что ваша страна более чистая, чем Киев и вообще Украина. Нет этих ужасных плакатов на каждом углу. И вообще ваш президент лучше нашего.

Юра, мужчина в рабочей одежде:
- Лукашенко, беспредел, неудавшаяся революция в прошлом году.

Людмила, пенсионерка:
- У меня родственники в Беларуси, они довольны своей жизнью. Получают хорошую пенсию.

Олег, водтель приличного «Фольксвагена»:
- Картошка, что же еще?

Аня, студентка:
- Наша страна самая классная, а о Беларуси ничего не знаю – не интересуюсь.

Юрий, предприниматель:
- Нам бы порядок такой, как там...

Александр, художник:
- Ансамбль «Песняры»

Валентина Григроьевна, заместитель директора коммунального предприятия:
- Я там не была, но знаю, что дороги там лучше, чистота. И сосед говорил, что если там на пешеходном переходе, не дай Бог, водитель не пропустил пешехода, то до следующего перекрестка он может не доехать – получит огромный штраф.

Владимир, солидный мужчина, вышедший из банка и садящийся в Джип-Лендкрузер:
- Сожаление.

Беседовал Эдуард БРОКАРЕВ

Пасол Ізраілю – пра выказваньні А.Лукашэнкі

"Выказваньні прэзыдэнта Беларусі на адрас габрэяў выклікаюць зьдзіўленьне і шкадаваньне" — так пракамэнтаваў пасол Ізраілю ў Беларусі Зэеў Бэн-Ар'е словы Аляксандра Лукашэнкі, што прагучалі 12 кастрычніка падчас сустрэчы з прадстаўнікамі расійскіх рэгіянальных СМІ.

Падчас прэсавай канфэрэнцыі кіраўнік Беларусі заявіў: "Калі вы былі ў Бабруйску, вы бачылі, у якім стане горад. У яго страшна было зайсьці! Сьвінушнік быў! Гэта ў асноўным быў яўрэйскі горад. Ну, вы ведаеце, як яўрэі ставяцца да месца, дзе яны жывуць. Паглядзіце ў Ізраілі".

Паводле ізраільскага дыплямата, у выказваньнях беларускага прэзыдэнта "чуюцца водгукі, як я спадзяваўся, даўно пахаванага гісторыяй адукаванага чалавецтва міту аб габрэях як неахайных, брудных, з дрэнным пахам, міту антысэміцкага". "Такое ўражаньне, што Бабруйск быў незалежнай габрэйскай вотчынай са сваім асобным бюджэтам, а не адным зь беларускіх гарадоў, дзе адказнасьць за добраўпарадкаваньне і сродкі для гэтага былі ў руках афіцыйных уладаў. Дзякуй Богу, што цяпер знаходзяць сродкі на добраўпарадкаваньне", — сказаў ізраільскі пасол. Ён таксама выказаў спадзяваньне, "што ў Беларусі, на зямлі якой загінула ад рук нацыстаў і іх памагатых ледзь не ўся адна з самых вялікіх у Эўропе габрэйскіх абшчынаў, будуць з большай увагай ставіцца да праяў антысэмітызму (напрыклад, да нядаўняга апаганеньня габрэйскіх магіл у тым самым Бабруйску і надпісам "Бей жыдоў" на доме, дзе знаходзіцца кіраўніцтва яўрэйскай абшчыны ў Слуцку) і ўстрымліваца ад любых заяў, якія могуць стымуляваць падобныя сумныя зьявы".

Дакрананьне да гісторыі

А.Мілінкевіч: 14 кастрычніка мы паказалі, што мы моц

Дарагія суайчыннікі!

Шчыра ўдзячны кожнаму з Вас, хто ў чарговы раз праявіў асабістую мужнасьць, прысвяціўшы нашай Беларусі і справе еўрапейскага выбару дзень 14 кастрычніка.

Мы даказалі, што ў Беларусі ёсць людзі, адданыя нашай Айчыне і гатовыя бараніць яе нацыянальны інтарэс.

Удзячны таксама еўрапейскім палітыкам і дыпламатам за сталую ўвагу да Беларусі і падтрымку нашай барацьбы за Свабоду і еўрапейскую будучыню Беларусі.

14 кастрычніка мы адваявалі сабе частку грамадскай прасторы, мы паказалі, што мы моц і таму ўлада была вымушаная лічыцца з намі ды ісці на саступкі. Але не забывайма пра дзесяткі затрыманых і няспраўдліва асуджаных напярэдадні Еўрапейскага маршу, не забывайма пра палітычных вязняў і сістэму палітычнага пераследу, навязаную беларускаму грамадству.

Мы на самым пачатку нашага шляху ў аб'яднаную Еўропу. Гэты шлях палягае на нашай большай адказнасці і волі беларускай грамадзянскай супольнасці.

Мы патрабуем ад улады выканання 12 ўмоваў Еўразвязу, паколькі выкладзеныя там крокі адпавядаюць інтарэсам кожнага грамадзяніна Беларусі. Мы патрабуем пачатку роўнага і ўзаемапаважлівага дыялогу ўлады з незалежным грамадствам.

Мы не адны. Нас шмат у нашай краіне, у нас вялікае кола добрых сяброў па ўсім свеце, з намі Бог, дух продкаў, наша вера і прага да Свабоды. Толькі еўрапейская Беларусь мае будучыню як дзяржава, як нацыя свабодных і заможных людзей

«ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР»
Антибашистская газета.
№28, октябрь 2007г.
Издатель и главный редактор - ЭДУАРД БРОКАРЕВ.
Brok61@yandex.ru
Т. 545 89 83. Издание непериодическое, выходит по мере возможности.
Тираж 299 экземпляров.
В номере использованы материалы сайтов:
http://www.svaboda.org/;
http://www.milinkevich.org/;
http://www.racyja.com/
http://www.uzgorak.na.by/

Сярэдневяковыя даспехі і ўзбраенне. Выстава пад такой назвай разгорнута у Горацкай карціннай галярэі. Цікавая і незвычайная экспазіцыя пабывала шмат у якіх музеях Беларусі, а зараз прыехала і ў Горкі, дзе будзе ў нашай выставачнай зале да канца кастрычніка.

Яе экспанаты апавядаюць аб гісторыі узбраення 16-17 стагоддзяў і паказваюць шлях развіцця ваеннай справы ў тыя часы. Яны таксама даюць уяўленне аб падзеях, што адбываліся ў часы сярэдневечча. Выстава, здымаючы завесу вякоў, быццам машына часу, пераносіць нас у іншыя эпохі, нібы то робіць сведкамі многіх гістарычных падзей. Больш за сто экспанатаў прадставілі ўзбраенне і ахоўнае адзенне тагачасных воінаў. У арсенале экспазіцыі есць і гусарскія даспехі, і зброя, а таксама - шчыты і шлемы розных канфігурацый.

Зіхаціць металам баявы рыштунак, пастроены, быццам падрыхтаваныя да баявога паходу або рыцарскага турніру, баявыя даспехі воінаў.

Пісьмовыя звесткі, археалагічныя матэрыялы сведчаць аб тым, што буйныя еўрапейскія і ўсходнія дзяржавы вялі барацьбу за тэрытарыяльны падзел, саперніцтва за пашырэнне сфер уплыву. Канфлікты і абвастрэнне супярэчнасцей часцей вырашаліся ваенным шляхам, у выніку чаго на карце з'яўляліся новыя буйныя магутныя дзяржавы. Ваенная тактыка, стратэгія, вопыт, уздзейнічалі на вынік баявых дзеянняў, але нямалаважную ролю іграла ўзбраенне і экіпіроўка воінаў. У многім дзякуючы перавазе ў зброі былі выйграны некаторыя буйныя бітвы. Воіны і збройнікі пастаянна займаліся яе ўдасканальваннем, вырабам новых узораў. Тон у гэтым задавалі швейцарцы, германцы, гішпанцы. Не ўступала ва ўзбраенні і Вялікае княства Літоўскае. Воіны, змагаючыся з захопнікамі, бралі на ўзбранене ўсё лепшае з арсенала ворага, прыстасоўваліся для сваіх умоў, робячы уласныя адкрыцці у ваенным мастацтве.

У сярэдзіне 16 стагоддзя ранняя дрэўкавая зброя, якая пераважала – пікі, алебарды, чэканы (разнавіднасць кавалерыйскага молата) паступова выцяснялася больш эфектыўным і надзейным: шаблямі, мячамі, шастаперамі булавамі, якія са з'яўленнем агнястрэльнай зброі таксама выходзілі з прымянення. На палях бітвы пераважную дамініруючую ролю стала іграць пяхота. Яе ўзбройвалі новай агнястрэльнай зброяй – мушкетам. Гэта доўгая і цяжкая стрэльба з кнотавым запальваннем (узгараннем). Мушкяцёры насілі на сабе ўсё неабходнае для стральбы. Порах змяшчалі у драўляных зарадах, кулі і пыжы - ў скураной сумцы. Акрамя мушкета, пехацінцы мелі шпагу.

Наконт узбраення гусара Стэфан Баторый, Кароль польскі і вялікі князь літоўскі, адзін з самых актыўных кіраўнікоў Рэчы Паспалітай, які ажыццяўляў рэформы у арміі, даваў наступныя указанні: "... салдат, які будзе служыць у гусарах, выходзячы на вайну, павінен садзіцца на каня з кап'ём, у латах і налакотніках, у шлеме, з кароткай стрэльбай ці палашом".

Даспехі гусара былі вельмі прыгожымі і значнымі па вазе. Але акрамя прыгажосці яны павінны былі абараняць уладальніка і вытрымаць пападанне з мушкета з 20 крокаў. Верхнюю частку цела прыкрывала стальная кіраса, якая складалася з нагрудніка і наспінніка, злучаных рамнямі. Да падолу нагрудніка мацаваўся набедранік. Плячо закрывалі спецыяльныя пласціны, якія даходзілі да локця. Ніжняя частка рук захоўвалася стальнымі пальчаткамі с доўгімі крагамі. Часта даспехі ўпрыгожваліся чаканкай ці медальёнам. Важным элементам абарончага ўзбраення з'яўляўся шчыт, які прымяняўся як у пяхоце, так і у кавалерыі. На выставе прадстаўлена разнавіднасць заходніх і усходніх узораў – шчыт-рандаш, шчыт-калкан, шчыт ліхтарны. Галаву воіна абараняў стальны шлем, падчас з падвясным забралам.

Патрэбна упамянуць яшчэ адну цікавую дэталь – конскі рыштунак, які складаецца з латнага намордніка, нагрудных лат і лат для абароны бакоў. Гэтаму рыштунку таксама ўдзялялася ўвага, таму што ў сярэдневеччы конь з'яўляўся адзіным сродкам перамяшчэння адносіны да яго былі асобыя.

Дзякуючы гэтай выставе мы можам самі дакрануцца да даўніны.

Алесь Валошка